# Школа бяспекі: лічбавая адукаванасць і ашуканства

У аддзяленні дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ашмянскага раёна прайшла інфармацыйная гадзіна па кібербяспецы з удзелам супрацоўніка раённага аддзела ўнутраных спраў. Мерапрыемства было прысвечана правілам абароны ад ашуканцаў у інтэрнэце і па тэлефоне, а таксама ролі кожнага грамадзяніна ва ўмацаванні лічбавага суверэнітэту краіны.




Інспектар па дазвольнай рабоце Ашмянскага РАУС Андрэй Стэльмах падрабязна разабраў з удзельнікамі найбольш распаўсюджаныя схемы падману. Супрацоўнік міліцыі падкрэсліў, што асабістая лічбавая адукаванасць і асцярожнасць кожнага чалавека - фундамент нацыянальнай бяспекі ў лічбавую эпоху. Абараняючы свае асабістыя дадзеныя, грашовыя сродкі, грамадзяне ўносяць непасрэдны ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай Канцэпцыі лічбавага суверэнітэту да 2030 года.



“Павышаючы сваю лічбавую адукаванасць, вы не толькі абараняеце сябе, але і ўмацоўваеце лічбавы суверэнітэт нашай Беларусі", - рэзюмаваў Андрэй Стэльмах.

Мерапрыемства прайшло ў рамках рэалізацыі дзяржаўнай праграмы "Лічбавая Беларусь". У гэты ж дзень людзі сталага ўзросту пазнаёміліся з рэспубліканскім праектам "Кожная пятніца - роднае сваё". Дарэчы, у аддзяленні распрацаваны план правядзення мерапрыемстваў у рамках праекту, дзе сталыя людзі змогуць далучыццца да культуры і папулярызацыі беларускіх традыцый, роднай мовы, нацыянальных каштоўнасцяў. Удзел у мерапрыемствах абяцае быць цікавым, змястоўным і па-сапраўднаму беларускім.



